Міні-кнігі Беларусі перададуць у дар Новай Александрыйскай бібліятэцы, інфармуе БелТА. Гэта 12 рэдкіх выданняў, сярод якіх — творы Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Францыска Скарыны, Статут ВКЛ. У калекцыі ёсць і арабаграфічныя рукапісы ў Беларусі, беларускія старадрукаваныя выданні, кітабы — рукапісныя кнігі беларускіх мусульман, старадаўнія беларускія рукапісы, аўтографы знакамітых тварцоў. Падчас нядаўняй сустрэчы беларускай дэлегацыі з кіраўніцтвам Новай Александрыйскай бібліятэкі была абмеркавана дата перадачы ў дар калекцыі рэдкіх кніг Беларусі егіпецкаму боку і афіцыйнай цырымоніі адкрыцця экспазіцыі. Як мяркуецца, гэта адбудзецца ў кастрычніку. Ідэю прапрацоўкі пытання вырабу і перадачы ў дар Новай Александрыйскай бібліятэцы міні-копій рэдкіх кніг Беларусі, якія захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы, выказаў старшыня ФПБ Міхаіл Орда падчас экскурсіі па бібліятэцы ў Александрыі, якая адбылася ў кастрычніку 2021 года. Тады ў гэтым горадзе праходзіў беларуска-егіпецкі форум.